Уладзімір
Шчасны

старшыня Нацыянальнай камісіі
Рэспублікі Беларусь
па справах ЮНЕСКА,
пасол па асобых даручэннях
Міністэрства замежных спраў
Рэспублікі Беларусь
(г. Мінск, Беларусь)



# ЮНЕСКА і новыя тэндэнцыі ў сусветнай культуры

Калі з нагоды чарговага юбілея ЮНЕСКА падсумоўваюцца вынікі дзейнасці гэтай міжнароднай арганізацыі, традыцыйна робіцца выснова, што самымі відавочнымі з'яўляюцца захады ў галіне культуры. Тлумачыцца гэта тым, што ЮНЕСКА была створана адразу пасля спусташальнай для культуры Другой сусветнай вайны. Менавіта тады ўзнікла вострая неабходнасць неадкладных захадаў дзеля захавання культурных каштоўнасцей і недапушчэння іх знішчэння ў будучым. Па меры вывучэння адпаведных праблем была зроблена выснова, што галоўнай пагрозай для культурных каштоўнасцей, як матэрыяльных, так і нематэрыяльных, з'яўляюцца не столькі прыродныя з'явы, колькі дзейнасць чалавека. Глабалізацыя, імклівае развіццё прамысловасці і звязаная з ім урбанізацыя, манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі прымусілі грамадства многіх краін шукаць сумесныя шляхі захавання дасягненняў культуры.



Адным з напрамкаў гэтай дзейнасці стала прыняцце шэрага міжнародных канвенцый. У гэтым годзе адзначаецца 40-я гадавіна найбольш вядомага дакумента — Канвенцыі аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, да якой Беларусь далучылася ў 1988 г. Неабходнасць выканання абавязацельстваў у рамках канвенцыі, увага з боку міжнародных экспертаў і сусветнай супольнасці садзейнічаюць прадухіленню пагрозы знікнення помнікаў культуры, як пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

націскам абыякавасці з боку насельніцтва і ўлад, ці наадварот — пад націскам камерцыйных інтарэсаў альбо адвольных спроб некампетэнтнай рэстаўрацыі. Паслядоўнае выкананне інструкцый па выкананні палажэнняў канвенцыі дапамагло пазбегнуць многіх хібаў па захаванню і выкарыстанню аб'ектаў сусветнай спадчыны, што знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі: Белавежскай пушчы, Замкавага комплексу «Мір», Архітэктурна-культурнага комплексу рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы, трыганаметрычных пунктаў «Дугі Струвэ». Разам з тым, адпаведна з канцэпцыяй ЮНЕСКА, поруч з фізічным захаваннем і рэстаўрацыяй аб'ектаў культурнай спадчыны неабходна распрацоўваць праграмы іх выкарыстання ў адукацыйных мэтах, а таксама для сацыяльнага і эканамічнага развіцця населеных пунктаў, у якіх яны знаходзяцца. Сусветны вопыт сведчыць аб тым, што толькі стварэнне асновы для эканамічна незалежнага (ці, як часам кажуць, гаспадарча-разліковага) функцыянавання можа гарантаваць упэўненасць у захаванасці помнікаў.

Працэс глабалізацыі, які назіраецца ва ўсім свеце, усё ў большай ступені ўздзейнічае на захаванасць найбольш далікатнай часткі культуры — нематэрыяльнай спадчыны. Гэта стала прычынай прыняцця ЮНЕСКА Міжнароднай канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Існуе думка, што Беларусь — адна з нямногіх краін Еўропы, дзе захаваўся жывы аўтэнтычны фальклор, які з'яўляецца асноўным элементам нематэрыяльнай спадчыны нацыі. Разам з тым удзельнікі «круглага стала» на тэму «Пытанні ўсебаковай аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны», які адбыўся ў студзені 2008 г., выказалі занепакоенасць у сувязі з пагрозай для існавання нематэрыяльнай спадчыны ў выніку працэсу глабалізацыі, а таксама з тэндэнцыяй спрашчэння, апрацоўкі, акадэмізацыі і тэатралізацыі традыцыйнай культуры. Не будзем згадваць сумныя прыклады, бо яны навідавоку. У сувязі з абавязацельствамі, што вынікаюць з Канвенцыі, наша краіна павінна стварыць нацыянальны рэгістр нематэрыяльнай спадчыны. Варта адзначыць, што згодна з Канвенцыяй элементамі нематэрыяльнай спадчыны з'яўляюцца звычаі, веды і ўменні, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, заснаваныя на пачуццях адметнасці і пераемнасці. Паняцце «ахова» ўключае захады па забеспячэнні жыццяздольнасці адпаведных элементаў нематэрыяльнай спадчыны шляхам ідэнтыфікацыі, папулярызацыі, перадачы наступным пакаленням, а не проста фіксацыі традыцыйнай культуры ў выглядзе манаграфій, дысертацый, шматтомных анталогій і манаграфій. Захаванне пакуль што рэальна існуючых элементаў нематэрыяльнай спадчыны ў якасці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эталонаў традыцыйнай культуры — вельмі няпростая задача. Яна патрабуе часта зусім новых падыходаў, а часам і рэвалюцыйных зрухаў у свядомасці. Інакш могуць здзейсніцца прадказанні скептыкаў, згодна з якімі нават цяперашняе пакаленне фалькларыстаў будзе вымушана перакваліфікавацца ў фолькархівістаў. Будзем спадзявацца, што дзейнасць Інстытута культуры Беларусі па захаванню нематэрыяльнай спадчыны пры фінансавай падтрымцы ЮНЕСКА і шырокім удзеле ўстаноў культуры на месцах аспрэчыць змрочныя прагнозы наконт традыцыйнай культуры Беларусі.

Варта ў сувязі з гэтым згадаць Усеагульную дэкларацыю ЮНЕСКА аб культурнай разнастайнасці, на падставе якой была распрацавана і прынята Канвенцыя «Аб ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення». Прыняўшы гэтыя дакументы, ЮНЕСКА пацвердзіла думку, згодна якой узровень развіцця як краіны, так і мясцовай супольнасці вызначаецца не колькасцю ўстаноў хуткага харчавання Макдональдс, а здольнасцю спалучаць пазітыўныя дасягненні цывілізацыі з нацыянальнымі адметнасцямі.

І нарэшце некалькі слоў пра ўклад ЮНЕСКА ў дзейнасць па сумеснаму выкарыстанню культурнай спадчыны.



Дзякуючы Праграме «Памяць свету» ЮНЕСКА стала каталізатарам дзейнасці па захаванню і сумеснаму выкарыстанню дакументальнай спадчыны. Пасля атрымання рэальнага суверэнітэту наша краіна вельмі ўважліва ставіцца да гэтай Праграмы. Варта згадаць праект «Радзівіліяна», які ажыццяўляецца шэрагам іншых краін свету. У выніку архіў і бібліятэка Нясвіжскай ардынацыі ўключаны ў Сусветны рэестр «Памяць свету». Ідзе праца над «Сапегіянай», пачынаецца праект па віртуальнай рэканструкцыі літаратурнай спадчыны Юзафа Крашэўскага. А раней была створана электронная бібліятэка беларускай літаратуры XI — XX стст., бібліятэка школьніка. Таму ёсць надзея, што дзякуючы найноўшым інфармацыйным і камунікацыйным тэхналогіям моладзь будзе больш актыўна цікавіцца айчыннай літаратурай.

Вопыт супрацоўніцтва нашай краіны з ЮНЕСКА сведчыць аб тым, што веданне міжнародных тэндэнцый у галіне культуры дапамагае будаваць адпаведным чынам палітыку ў галіне культуры на нацыянальным узроўні. Плён узаемадзеяння з ЮНЕСКА залежыць у першую чаргу ад актыўнасці непасрэдна ўстаноў культуры. Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА гатова абмеркаваць любыя ініцыятывы ў гэтым кірунку, у першую чаргу з боку Інстытута культуры Беларусі, 20-годдзе якога мы сёння адзначаем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аляксандр Лакотка

доктар гістарычных навук,
доктар архітэктуры,
член-карэспандэнт НАН Беларусі,
дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)



# Развіццё нацыянальнай культуры — адна з прыярытэтных задач гуманітарнай навукі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Станаўленне маладой суверэннай сучаснай Беларусі выпала на складаны час глабальных крызісных з'яў, у якіх апынуўся свет пасля распаду СССР. Супярэчнасці паміж глабальным і нацыянальным, традыцыяй і мадэрнізацыяй, спажывецкім і духоўным ставяць пытанне аб ролі і значэнні гуманітарных навук у захаванні стабільнасці і далейшага развіцця сусветнай цывілізацыі. Міжэтнічныя і міжканфесійныя канфлікты, эканамічныя крызісы выклікаюць неспакой за захаванне маральных агульначалавечых каштоўнасцей, за трываласць падмурка, на якім стаяць спрадвечныя асновы асобы, грамадства, народа, чалавецтва.



На IV Усебеларускім народным сходзе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падкрэсліў, што культура — неад'емны складнік суверэнітэту. «Дабрабыт нацыі, — сказаў Кіраўнік дзяржавы, — вызначаецца яе эканамічным патэнцыялам. Зразумела, што без яго няма моцнай дзяржавы. Але і без развіцця духоўнай культуры таксама няма дзяржавы... Культура фарміруе дух нацыі! Вось чаму на пярэдні план ставіцца задача выхавання сумленнага чалавека, захавання і ўмацавання культурных і ідэалагічных асноў дзяржавы і грамадства» [1].

На фоне 60-гадовага будаўніцтва Еўрапейскага Саюза ў Еўрапейскім Савеце па культуры паўстала пытанне аб захаванні моўнай і культурнай разнастайнасці. І гэта падаецца сімптаматычным, калі ўспомніць канвенцыі